У дадатку да кнігі змешчаны тры найбольш выразныя дакументы, якія датычацца судовага працэсу над Лышчынскім. Аднак гэтыя дакументы неаднаразова друкаваліся ў нашай краіне і за мяжой. Неабходна было б змясціць выяўленыя ў свой час у ЦДГА БССР (Гродна) новыя дакументы пра вучонага. Аўтары пішуць, што яны «больш поўна раскрываюць жыццёвы шлях і атэістычную спадчыну К. Лышчынскага». Яны яшчэ не друкаваліся, а ў свой час былі перададзены ў Інстытут філасофіі і права АН БССР і перакладзены па рускую мову.

Аднак названыя недахопы не змяншаюць навуковай вартасці кнігі. Гэта глыбокае гісторыка-філасофскае даследаванне. Напісанае эмацыянальна, з добрым веданнем справы, яно будзе несумненна карысным у камуністычным выхаванні працоўных.

*Я. Н. МАРАШ*

## ЛЕНІНСКАЯ СТРАТЭГІЯ НАВУКІ

Сёння, калі вырашаюцца складанейшыя праблемы перабудовы і абнаўлення савецкага грамадства, ленінскія ідэі аб ролі навукі ў грамадскім прагрэсе, гістарычны вопыт па кіраўніцтву навукай у СССР маюць важнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. У сувязі з гэтым можна вітаць з'яўленне манаграфіі С. І. Мокшына * — абагульняючай працы, якая абапіраецца на працы У. І. Леніна, матэрыялы з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК партыі, зборнікі ленінскіх і партыйных дакументаў, біяграфічную хроніку У. І. Леніна, успаміны бліжэйшых саратнікаў Уладзіміра Ільіча, новыя архіўныя і малавядомыя дакументы.

У кнізе пераканаўча паказана, што імення Ленін пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі вызначыў новую сацыяльную ролю навукі, распрацаваў метадалагічныя прынцыпы палітыкі партыі ў галіне навукова-тэхнічнага прагрэсу, усебакова тэарэтычна абгрунтаваў канцэпцыю арганізацыі і кіраўніцтва навукай у сацыялістычнай дзяржаве, намеціў комплекс практычных мерапрыемстваў па развіццю галоўных напрамкаў у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навук.

Асаблівасцю работы з'яўляецца той вызначальны для аўтара творчы падыход, праўдзівы ленінскі погляд на гісторыю фарміравання аблічча новай савецкай навукі, глыбокія змяненні яе ўзаемаадносін з палітыкай і эканомікай, месца ў грамадстве. Тэма, несумненна, актуальная; у такой працы маюць патрэбу не толькі вучоныя-гісторыкі, але і філосафы, эканамісты, юрысты, сацыёлагі, навуказнаўцы, усе, хто цікавіцца праблемамі навукі.

Кніга С. І. Мокшына дзеліцца на 5 раздзелаў: «Магутная сіла сацыяльнага прагрэсу», «Кіраванне навукова-тэхнічным прагрэсам», «Навуковы патэнцыял — на службу сацыялізму», «Саюз навукі і працы: роля чалавечага фактара», «Пераемнасць і наватарства ў развіцці ленінскіх ідэй».

У першым раздзеле ўвага чытачоў канцэнтруецца на распрацоўцы У. І. Леніным тэарэтыка-пазнавальных і метадалагічных пытанняў развіцця навукі. З першых жа дзён пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі перад Савецкай дзяржавай паўстала важная задача — стварыць прынцыпова новую сістэму арганізацыі навукі, якая адпавядала б задачам пабудовы сацыялізма. Стварэнне такой сістэмы, найбольш дэмакратычнай і рэвалюцыйнай, праходзіла ў цяжкіх умовах недахопу сродкаў, матэрыяльных цяжкасцей, варожага капіталістычнага акружэння. І зусім зразумела, піша аўтар, што будаўніцтва новага грамадства ў Расіі можна было весці толькі з улікам дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, выкарыстання патэнцыялу наяўных навуковых сіл, г. зн. канкрэтна-гістарычных умоў пераходу ад капіталізма да сацыялізма.

У працах У. І. Леніна, у яго кнігах і артыкулах, прамовах і дакладах, у жывой практыцы дзяржаўнага кіраўніцтва пытанні развіцця навукі занялі важнае месца. Яны былі адным з галоўных звёнаў агульнага ленінскага плана сацыялістычнага будаўніцтва. Ён фармулюе важнейшае тэарэтычнае палажэнне аб тым, што сацыялізм немагчымы без навукі, бо толькі ён вызваліць «навуку ад яе буржуазных путаў, ад яе заняволення капіталам, ад яе рабства перад інтарэсамі бруднага капіталістычнага карысталюбства» (Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 36. С. 381).

Перад партыяй, усім народам была пастаўлена задача — навучыцца працаваць па-новаму з прымяненнем навуковых прынцыпаў арганізацыі працы, паколькі Савецкай дзяржаве неабходна было ўсямерна развіваць прадукцыйныя сілы краіны, у першую чаргу ўздымаць прадукцыйнасць грамадскай працы. Вырашэнне гэтай кардынальнай задачы правадыр звязваў з дасягненнем усеагульнай адукаванасці працоўных, з бурным развіццём навукі і тэхнікі.

Абапіраючыся на шматлікія архіўныя крыніцы, успаміны сучаснікаў і саратнікаў У. І. Леніна, якія служаць сапраўднай скарбніцай матэрыялаў па гісторыі савецкай навукі, аўтар звяртаецца да пытанняў планавання і кіравання навукова-тэхнічным прагрэсам. Гэта дае магчымасць паглядзець на здавалася б вядомыя падзеі па-ін-

* Мокшин С. И. Стратегия ускорения. Ленинская концепция научно-технического прогресса. М., 1988. 368 с.

шаму. Уладзімір Ільіч выступаў за цэнтралізацыю ўсёй навукова-тэхнічнай справы ў Савецкай Расіі. Гэту функцыю ажыццяўляў навукова-тэхнічны аддзел пры Вышэйшым Савеце Народнай Гаспадаркі. Перад аддзелам была пастаўлена задача ўкаранення навуковых дасягненняў у практыку вытворчасці, размеркавання паміж навуковымі і тэхнічнымі ўстановамі, таварыствамі, лабараторыямі, інстытутамі, доследнымі станцыямі заданняў Савецкай улады, якія вынікаюць з патрэбнасцей народнай гаспадаркі, і кантролю над вырашэннем гэтых заданняў. У спецыяльным дакуменце, які ўвайшоў у гісторыю як «Накід плана навукова-тэхнічных работ», перад навукай было пастаўлена шырокае кола пытанняў, звязаных з паскораным планамерным і комплексным развіццём навуковых даследаванняў, у адзінае зведзены праблемы развіцця прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навук. У. І. Ленін з'яўляўся непасрэдным кіраўніком лепшымі навуковымі сіламі краіны пры распрацоўцы вядомага плана ГАЭЛРО.

Неабходнасць навукова-абгрунтаваных прагнозаў развіцця эканомікі, навукі і тэхнікі на працяглы час як ніколі актуальная ў сучасных умовах і вырашаецца партыяй пасля красавіка 1985 г. у духу ленінскага падыходу. Па вядучых напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу прыняты маштабныя мэтавыя праграмы. З іх улікам складзены і рэалізуецца план дванаццатай пяцігодкі, у якім асаблівая роля ў стратэгіі паскарэння адводзіцца навуцы. На гэты фундамент, на шырокія магчымасці сацыялізма і абапіраюцца ідэі абнаўлення сацыялістычных грамадскіх адносін, забеспячэння іх устойлівай адпаведнасці ўзрослым прадукцыйным сілам, працэсу рэвалюцыйнай перабудовы, што разгарнулася ў краіне.

Звяртаючыся да праблем выкарыстання навуковага патэнцыялу ў інтарэсах народнай гаспадаркі, С. І. Мокшын грунтоўны характарызуе практычную дзейнасць У. І. Леніна. Пры яго актыўнай падтрымцы ўжо ў першыя гады Савецкай улады была створана разгалінаваная сетка навукова-даследчых інстытутаў (больш за 33), якія ахоплівалі асноўныя галіны прыродазнаўства і тэхнікі. Было зроблена нямала адкрыццяў, што склалі гонар айчыннай навукі.

Вялікі дакументальны матэрыял карпатліва сабраны, старанна падабраны і абагульнены аўтарам, дае рэальную карціну цяжкасцей і дасягненняў. Тут і распрацоўка фізічных і хімічных праблем, радыётэхнікі, сельскай гаспадаркі, арганізацыя навуковых экспедыцый па вывучэнню прыродазнаўчых і прадукцыйных сіл розных рэгіёнаў краіны. Яркім прыкладам можа служыць вырашэнне праблемы атрымання радыю з айчыннай сыравіны, даследаванне Курскай магнітнай анамаліі і многія іншыя, непасрэдна звязаныя з практычнай дзейнасцю кіраўніка Саўнаркома. Адзначым, што гэты працэс атрымаўся б больш поўным і важкім, калі б аўтар выкарыстаў матэрыял, які адлюстроўвае станаўленне і развіццё навукі ў саюзных рэспубліках. Агульнавядома, што навуковыя цэнтры функцыяніравалі на Украіне, у Беларусі, Сярэдняй Азіі, забяспечваючы шырокі фронт навуковых даследаванняў у краіне. Выкарыстанне такіх матэрыялаў было б карысна і для ілюстрацыі сучасных праблем і дасягненняў вучоных СССР.

У манаграфіі паказваюцца тыя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя цяжкасці, супярэчнасці, што стаялі на шляху паскоранага развіцця навукі. У 70-х — пачатку 80-х гадоў было дапушчана адставанне матэрыяльна-тэхнічнай базы навуковых арганізацый, аслаблена ўкараненне дасягненняў у вытворчасць, што прывяло да адставання ў навукова-тэхнічным развіцці ад краін Захаду. І як канстатавалася на чэрвеньскім (1987 г.) Пленуме ЦК КПСС, адбылося гэта не з-за адсутнасці навуковых задзелаў, а галоўным чынам па прычыне неўспрымальнасці народнай гаспадаркі да наватўвядзенняў. Гэта патрабавала ад партыі прыняцця жорсткіх рашэнняў з мэтай пераводу эканомікі на новую сістэму кіравання, ператварэння навукова-тэхнічнага прагрэсу ў галоўны фактар эканамічнага росту.

Саюз навукі і працы непасрэдна звязаны з чалавечым фактарам. У сваіх працах У. І. Ленін вялікую ўвагу надаваў падрыхтоўцы, выхаванню і выкарыстанню кадраў навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі. Пераканаўча паказаны ленінскі стыль работы з кадрамі, яго ўменне падтрымаць спецыялістаў, якія аддавалі свае веды і вопыт стваральнаму будаўніцтву новага грамадства. Выключна важную ролю ў развіцці савецкай навукі адыграла сустрэча вучоных з кіраўніком Саўнаркома 27 студзеня 1921 г. Не абыходзіць аўтар цяжкасцей у прыцягненні на свой бок старой навуковай інтэлігенцыі, падрыхтоўкі новых кадраў.

Гаворыць ён і аб той удушлівай атмасферы культу асобы Сталіна, якая не магла не адбіцца. Але нельга згадзіцца са сцвярджэннем С. І. Мокшына аб тым, што «негатыўныя з'явы не змаглі перашкодзіць поспехам, атрыманым савецкім народам... у сацыялістычным будаўніцтве, у тым ліку і развіцці навукі і тэхнікі» (с. 70). Вынікі сталінізму ляжаць у іншай плоскасці: гэта спыненыя і скалечаныя лёсы вучоных, разбураныя навуковыя школы і традыцыі, дэмаралізацыя і падман навуковай моладзі, страта аўтарытэту савецкай навукі і яе шматгадовая ізаляцыя ад сусветнай навукі, дэфармацыя навуковай этыкі, ад якой наша навука не аправілася яшчэ і да нашых дзён.

Не паступаючыся гістарычнай дакладнасцю і строгай канкрэтнасцю кожнага факта, аўтар паказвае пераемнасць і наватарства КПСС у развіцці ленінскіх ідэй. У новых гістарычных умовах, калі ў Савецкай краіне створаны магутны навуковы патэнцыял, партыя паглыбіла і развіла навукова-тэхнічную палітыку, па-наватарску распрацавала адпавядаючую пераломнаму этапу стратэгію паскарэння развіцця грамадства, сфар-

міравала новыя падыходы да яе ра[illegible]. Чырвонай ніткай праводзіцца думка, што камандна-бюракратычная сістэма кіравання не адпавядае ленінскім поглядам на кіраўніцтва навукай.

Аўтар расказвае аб сур'ёзных і важных навуковых праблемах у дастаткова папулярнай форме. Гэта, думаецца, забяспечыць кнізе поспех у чытачоў.

*Г. У. КАРЗЕНКА*

# НАВУКОВАЕ КІРАВАННЕ КУЛЬТУРАЙ

Ва ўмовах сацыялізма кіраванне усё больш [illegible] найбольш глыбокіх і дынамічных структур сацыяльнага быцця. Імкненне к навуковасці кіравання грамадскімі працэсамі былі ў першую чаргу накіраваны рашэнні студзеньскага і ліпеньскага (1987 г.), лютаўскага (1988 г.) Пленумаў ЦК КПСС. Значнае месца ў матэрыялах гэтых пленумаў занялі і пытанні культуры — ад культуры кіравання і культуры вытворчасці да кіравання культурай і вытворчасцю духоўных каштоўнасцей.

Адносіны, што існуюць паміж культурай і кіраваннем, дыялектычныя. З аднаго боку, здольнасць суб'екта кіраваць тымі ці іншымі аб'ектамі і ўласцівасці аб'ектаў быць кіруемымі пэўным суб'ектам сведчаць аб ступені [illegible] чалавекам навакольнага свету і адпаведна аб меры ўплыву чалавека на арганізацыю і развіццё прыродных, грамадскіх, культурных сістэм, г. зн. аб культуры як крытэрыі ацэнкі кіраўніцкіх рашэнняў.

З другога боку, разуменне культуры як спецыфічнага спосабу чалавечай дзейнасці мае на мэце наяўнасць сродкаў аптымізацыі дзейнасці і культуры. Такім чынам, разглядаецца як здольнасць чалавека эфектыўна кіраваць усімі падуладнымі яму прыроднымі і грамадскімі працэсамі.

Культура і кіраванне арганічна ўзаемазвязаны і неадрыўныя адно ад аднаго, выступаючы ў многім перадумовай адно аднаго. Асаблівае значэнне ў гэтай сувязі набывае праблема кіравання самой культурай, ад эфектыўнага вырашэння якой у многім залежыць культура кіравання наогул. Аналізу гэтай праблемы і прысвечана рэцэнзуемая праца А. П. Мельнікава і П. П. Сілівончыка — адна з першых спроб разгледзець працэс навуковага кіравання ў духоўнай сферы грамадства*.

Навізна работы абумоўлена перш за ўсё [illegible] выбранага аспекту праблемы — яе сацыяльна-палітычнага зместу, а таксама патрэбнасцю тэорыі і практыкі сацыялізма ў вызначэнні рэальных перспектыў разгортвання працэсаў развіцця культуры, якія, натуральна, не могуць быць пушчаны на самацёк. У манаграфіі правільна падкрэсліваецца, што распрацаваны У. І. Леніным план культурнай рэвалюцыі з'явіўся, па сутнасці, першым у гісторыі чалавецтва практычным вопытам кіравання духоўным жыццём грамадства.

У рабоце дэталёва раскрываецца структура і механізм кіравання духоўнай культурай як дынамічная і шматузроўневая сістэма, якая ўключае рад падсістэм рознай ступені складанасці. Пры гэтым пад кіраваннем разумеецца свядомае планамернае ўздзеянне на духоўную культуру як цэласную сістэму вытворчасці, размеркавання і спажывання духоўных каштоўнасцей у адпаведнасці з аб'ектыўнымі заканамернасцямі яе прагрэсу ў інтарэсах усяго грамадства ў цэлым і кожнага яго члена паасобку.

Такі падыход дазволіў аўтарам глыбока разгледзець кіраванне рознымі відамі творчай дзейнасці людзей, занятых у галіне духоўнай вытворчасці, а таксама далейшае ўдасканаленне сродкаў, форм і метадаў размеркавання і засваення культурных даброт.

Асноўную ўвагу даследчыкі канцэнтруюць на [illegible] навуковага кіраўніцтва і кіравання культурнымі працэсамі, перш за ўсё на кіруючай ролі партыі ў духоўнай сферы. У манаграфіі змястоўна і глыбока раскрываюцца тры асноўныя функцыі партыйнага кіраўніцтва ў галіне культуры — палітычная, арганізацыйная і выхаваўчая, якія непарыўна, арганічна звязаны паміж сабой, узаемаабумоўліваюць і дапаўняюць адна адну. На значным эмпірычным матэрыяле, у тым ліку з жыцця Беларускай рэспублікі, аўтары раскрываюць прынцыпы партыйнага кіраўніцтва ў духоўнай сферы і на ўзроўні пярвічных арганізацый, і ў рамках партыйных органаў сярэдняга звяна, а таксама ў маштабах цэнтральных партыйных органаў.

У манаграфіі правільна падкрэсліваецца, што, ажыццяўляючы кіраўніцтва культурным будаўніцтвам, партыя забяспечвае адпаведнасць бягучай культурнай палітыкі палітычнай лініі ў цэлым. Гэта функцыя выяўляецца ў праве аўтарытэтнага ўмяшання ў працэс кіравання культурным будаўніцтвам усюды, дзе для гэтага ёсць дастатковыя падставы. Аднак такое ўмяшанне не павінна азначаць падмены функцый органаў улады і кіравання: яно мае на мэце толькі публічную пастаноўку пытання аб прынцыповых недахопах у бягучай культурнай палітыцы, растлумачэнне грамадскай думцы іх адмоўных вынікаў, унясенне ў адпаведныя органы ўлады рэкамендацый аб ухіленні гэтых недахопаў.

---

* Мельников А. П., Силивончик П. П. Научное управление культурой в социалистическом обществе. Минск: Университетское. 1988. 159 с.